**ВО́СПА**, Воспіца, Воспік, Рабая, Рабуха, Шчарбачка, Ліхая і інш., дэман хваробы ў выглядзе жанчыны. Паводле міфалагічных уяўленняў, злосная і агідная старая з адным моцным зубам, які тырчыць вонкі. Яна пырскае слінаю ў намечаную ёю ахвяру. З-за гэтага на твары ў той застаюцца сляды гэтай хваробы (пра перахварэўшага смехам кажуць, што на яго фізіяноміі чэрці гарох малацілі ці ячменныя крупы дралі). Малявалася В. таксама ў вобліку падарожніцы, якая разносіць па свеце хваробу, аберагаючы, аднак, тыя хаты, дзе ёй далі прытулак. У аналагічных антрапаморфных вобразах паўстаюць такія хваробы, як ліхаманка, халера, пошасць, паморак і інш.

*Літ.*: Беларуская міфалогія. Мн., 2002. С. 183—184.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ